

КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ Ў КРЭДЫТ 3



ГІСТОРЫЯ АДНАГО ШПІТАЛЯ 8



6 КРАСАВІКА 2024 г. СУБОТА

№ 69 (30203)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА


# Прыпыненне дзеяння, але не выхад

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў згоду на ўнясенне ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу праекта закона «Аб прыпыненні дзеяння Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе». Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дадзены дагавор быў ратыфікаваны Беларуссю і ўступіў у сілу ў 1992 годзе. Ён прадугледжвае абмежаванне сумарных узроўняў звычайных узбраенняў і тэхнікі па пяці асноўных катэгорыях (танкі, баявыя браніраваныя машыны, артылерыя, ударныя верталёты і баявыя самалёты), а таксама механізмы праверкі выканання абавязацельстваў (абмен інфармацыяй і правядзенне інспекцый).

Праект закона прадугледжвае прыпыненне дзеяння ДЗУСЕ, але не азначае выхад Беларусі з яго і спыненне ажыццяўлення ва Узброеных Сілах унутраных працэдур, звязаных з яго выкананнем.

Беларусь у поўным аб'ёме выконвае абавязацельствы па дагаворы, у тым ліку няўхільна прытрымліваецца ўстаноўленых гранічных узроўняў наяўнасці ўзбраенняў, ваеннай тэхнікі і асабовага складу Узброеных Сіл.

Тым не менш у жніўні 2022 года Чэхія, а ў сакавіку 2023 года Польшча прынялі рашэнне аб невыкананні дагавора ў дачыненні да Беларусі.

У лістападзе 2023 года Паўночнаатлантычны савет НАТА зрабіў заяву аб намеры дзяржаў — членаў альянсу, якія ўдзельнічаюць у дагаворы, прыпыніць яго дзеянне. З ДЗУСЕ таксама выйшла і Расійская Федэрацыя.

Прыпыненне дзеяння дагавора дзяржавамі — членамі НАТА і іх саюзнікамі фактычна азначае спыненне яго функцыянавання.

# ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ



Фота БелТА.

На заводзе «Магілёўтрансмаш» першыя студэнцкія атрады пачалі работу. Хлопцы з нецярплівасцю чакалі такой магчымасці з мінулага года. Для іх працаўладкаванне не толькі добры заробак, але і бясцэнны вопыт, магчымасць зарэкамендаваць сябе і знайсці сярод аднагодкаў па-сапраўднаму надзейных сяброў і таварышаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ПАРХОМЧЫК, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У апошнія гады само жыццё прымусіла нас перагледзець свае планы ў галіне развіцця прамысловых прадпрыемстваў. Прамысловасць добра спрацавала ў 2023 годзе з дынамікай росту 7,7 працэнта, унутраны валавы прадукт вырас на 3,9 працэнта. Па выніках першых двух месяцаў гэтага года таксама захоўваецца станоўчая дынаміка. ВУП павялічыўся на 4 працэнты, прамвытворчасць — на 7,1 працэнта. Ёсць упэўненасць, што такая дынаміка захаваецца і ў найбліжэйшы час. У Беларусі вялікая ўвага ўдзяляецца пытанням імпартазамяшчэння і лакалізацыі. Некаторыя кампаніі з недружалюбных дзяржаў перасталі пастаўляць свае камплектавальныя ў нашу краіну, кінуўшы нам тым самым пэўны выклік. З упэўненасцю магу сказаць, што нашы прамыслоўцы з гэтым выклікам справіліся».*

# «Як ніколі востра мы адчуваем, што павінны быць адзіныя ва ўсім»



Фота БелТА.

**У Савеце Рэспублікі прайшла сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ з актывам пярвічных арганізацый БСЖ рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў.**

«Лічыце, што ў нас сёння дыялогавая пляцоўка, дзе мы разам будзем казаць пра тыя рэчы, якія хвалююць вас, я раскажу пра тое, што бачыцца мне. Як ніколі востра мы адчуваем, што павінны быць адзіныя ва ўсім. Чым часцей мы будзем сустракацца адно з адным, тым больш будзе поспех у нашай рабоце», — сказала Наталля Качанава.

Спікер падкрэсліла, што ахова здароўя — гэта прыярытэтны кірунак дзяржаўнай палітыкі Беларусі. «У сваёй рабоце мы прытрымліваемся задач, якія ставяцца кіраўніком дзяржавы, а таксама зыходзячы з тых пытанняў, якія ён агучвае ў штогадовым звароце да народа і парламента, і, вядома, рашэнняў Усебеларускага народнага сходу. Мне рашэнні УНС вельмі імпануюць: усё дакладна і зразумела — чатыры кірункі: моцныя рэгіёны, шчаслівая сям'я, інавацыйнае развіццё, дзяржава-партнёр. Дзяржава ўзяла на сябе гэтыя сацыяльныя гарантыі, і мы павінны гэта падтрымліваць, нягледзячы ні на якія перыпетыі. Краіна жыве, краіна развіваецца даволі паспяхова. Ні адна праграма не згорнута».

СТАР. 2

Абітурыент-2024

# ЛАГІСТЫ І КАНФЛІКТОЛАГІ. МІЖНАРОДНЫЯ

## З гэтага года на факультэце міжнародных адносін БДУ адкрываецца навучанне па дзвюх новых спецыяльнасцях

**Айчынны экспарт памяняў напрамак. Міжнародныя бізнес-аперацыі павярнуліся на Усход, наладжваецца цеснае супрацоўніцтва з краінамі Афрыканскага кантынента. Адпаведна расце і неабходнасць дзяржавы ў кваліфікаваных кадрах у галіне кіравання ланцужкамі паставак, забеспячэння эфектыўнасці і бяспекі перавозак і ў выніку падтрымання канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі на сусветным рынку. Значыць, трэба рыхтаваць адпаведных спецыялістаў — вырашыла кіраўніцтва факультэта міжнародных адносін БДУ і адкрыла навучанне па спецыяльнасцях «Міжнародная лагістыка» і «Міжнародная канфліктагалогія». Пра гэта нам расказала дэкан факультэта Алена ДАСТАНКА.**



Студэнты факультэта на занятках.

СТАР. 3

Спажывец

# СЕЗОН ЛІЧЫЦЬ АДКРЫТЫМ!

## Колькі каштуе ў гэтым годзе «самы даступны адпачынак»?



**Нарэшце выглянула сонейка і самыя нецярплівыя адкрылі новы «шашлычны сезон — 2024». У суботу і нядзелю папулярныя загарадныя лакацыі ўжо ахутаныя духмяным дымам і дражняць усіх, хто прыехаў проста пагуляць на прыродзе, апетытным пахам смажанага мяса. Многія альтанкі занятыя, носяцца дзеці, добразычлівыя хатнія сабакі віляюць хвастамі і лісліва глядзяць на мангалы, дзе гатуецца шашлык. Словам, звычайная наша вясна ўступае ў свае правы.**

СТАР. 6

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэзідэнт Зімбабвэ аб'явіў у краіне рэжым нацыянальнага бедства



Эмерсан Мнангагва аб'явіў у краіне рэжым нацыянальнага бедства з-за катастрафічнай засухі, якую выклікала кліматычная з'ява Эль-Ніньё, паведаміла Reuters. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што краіне спатрэбіцца больш чым 2 мільярды долараў, каб накарміць мільёны людзей, якія пакутуюць ад голаду. Прэзідэнт расказаў, што Эль-Ніньё выклікаў цяжкую харчовую сітуацыю, таму што на 80 працэнтаў тэрыторыі краіны выпала мала дажджоў. Згодна з яго прагнозам, больш за 2,7 мільёна чалавек у Зімбабвэ будуць сёлета галадаць. Мнангагва адзначыў, што ўрад будзе надаваць прыярытэтную ўвагу азімым пасевам, каб павялічыць запасы, і будзе працаваць з прыватным сектарам над імпартам збожжа. З аналагічнымі заявамі раней выступілі ўлады Замбіі і Малаві, паколькі засуха, выкліканая глабальнай кліматычнай з'явай Эль-Ніньё, прывяла да гуманітарнага крызісу на поўдні Афрыкі. Як паведаміла выданне Politico, у Малаві каля 9 мільёнаў чалавек, палова з якіх дзеці, маюць патрэбу ў дапамозе.

## Губернатар Мурманскай вобласці цяжка паранены ў выніку нападу

ISSN 1990 - 763X

Губернатар Мурманскай вобласці Андрэй Чыбіс падвергся нападу пасля сустрэчы, якая адбылася ў горадзе Апатыты. Ён атрымаў нажавое раненне ў жывот. Пра гэта паведаміла ТАСС. Як стала вядома, узброены замах адбыўся на выхадзе з мясцовага дома культуры, дзе праводзіўся асабісты прыём грамадзян губернатарам.



Злачынец быў затрыманы супрацоўнікам Расгвардыі. Пасля здарэння Андрэй Чыбіс змог самастойна дабрацца да аўтамабіля, а падчас транспарціроўкі ў аперацыйную знаходзіўся ў прытомнасці і адказваў на пастаўленыя пытанні. Прадстаўнікі прэс-службы кіраўніка рэгіёна праінфармавалі, што губернатару была праведзена аперацыя, яго стан ацэньваецца як цяжкі. Пракуратурай Мурманскай вобласці ў дачыненні да 42-гадовага жыхара горада Апатыты ўзбуджана крымінальная справа «Аб замаху на забойства ў сувязі з ажыццяўленнем службовай дзейнасці». Нападальніка дапыталі, ён растлумачыў свой учынак асабістай непрыязнасцю.

## Небяспечная акула-мака з'явілася каля берагоў егіпецкага курорта Хургада



Супрацоўнікі службы бяспекі на вадзе заўважылі небяспечную для людзей акулу-мака каля берагоў вострава Абу-Мінкар зусім побач з Хургадай, паведаміў партал Cairo24. «Супрацоўнікі па бяспецы на вадзе папярэдзілі аб неабходнасці прыняцця мер засцярогі, каб пазбегнуць нападу акулы на жыхароў і турыстаў», — піша выданне. Як адзначае партал, у запаведніках Чырвонага мора працягваюцца пошукі акул з мэтай вывучэння іх паводзін і прычын з'яўлення на мелкаводдзі. Востраў Абу-Мінкар славіцца біялагічнай разнастайнасцю: там часта сустракаюцца дэльфіны і розныя марскія чарапахі. Акула-мака лічыцца адным з самых небяспечных відаў акул, якія жывуць у водах Чырвонага мора, пасля тыгровай акулы. Неаднаразова былі зафіксаваны выпадкі нападу гэтай акулы на чалавека.

## КОРАТКА

- Міністр унутраных спраў Іван Кубракоў правёў асабісты прыём грамадзян у Савеце Міністраў.
- **Золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 красавіка склалі $8,353 млрд.**
- БУТБ чакае росту паставак металапрадукцыі і абсталявання з Чалябінскай вобласці.
- **Фізасобы ў Беларусі ў сакавіку прадалі на $109,4 млн валюты больш, чым купілі.**
- «АМКАДОР» прадставіў навінкі дарожна-будаўнічай тэхнікі, якая сышла з канвеера ў красавіку 2024 года.
- **У медыцынскіх універсітэтах Расійскай Федэрацыі і Казахстана сёлета будуць праходзіць урачэбную практыку найлепшыя студэнты Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.**

60+: жыць цікава!

# АЖУРНЫ АБЯРЭГ,

## або Велікодныя набожнікі-выцінанкі бабулі Лёні

**Леаніле СУПРАНОВІЧ з аграгарадка Наваселле — 86 гадоў, больш чым 70 з якіх яна стварае папяровыя набожнікі (аправы для абразоў), яны на час свята замянялі тканыя ды вышытыя ручнікі. Упершыню такі ажурны цуд 13-гадовая Лёня ўбачыла ў хаце ў сваёй цёткі. Тая прывезла незвычайны «дэкор» са сваёй малой радзімы — з Радашковічаў — і ўпрыгожыла ім перад Вялікаднем чырвоны кут...**

СТАР. 8



Леаніла СУПРАНОВІЧ са сваёй суседкай Ларысай КРЫЛОВІЧ. На фота ў альбоме — Ларыса Антонаўна ў сукенцы, якую шмат гадоў таму спецыяльна для яе пашыла цётка Лёня.

# «Як ніколі востра мы адчуваем, што павінны быць адзіныя ва ўсім»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

За чатыры гады членамі Савета Рэспублікі праведзена больш чым восем тысяч сустрэч з працоўнымі калектывамі, каля дзвюх тысяч прамых тэлефонных ліній, расказала Наталля Качанава.

«Працуючы над законапраектамі ў Савеце Рэспублікі, мы стараемся вельмі шмат працаваць з людзьмі. Пытанняў, з якімі людзі звяртаюцца, даволі шмат. За сёмае скліканне да нас паступіла 30,5 тысячы зваротаў. Гэта на 60 % больш, чым за шостае скліканне», — адзначыла яна. Мы выкарыстоўваем гэта пры рабоце над законапраектамі. Працуючы з людзьмі, мы бачым, на чым трэба акцэнтаваць сваю ўвагу», — падкрэсліла спікер.

Гаворачы аб ролі грамадскай супольнасці ў палітычным жыцці краіны, Наталля Качанава адзначыла: «У рабоце грамадскіх арганізацый, партый у нашай краіне бачу добрую апору ўлады. Аб гэтым гаварыў і Прэзідэнт на з'ездзе прафсаюзаў. Калі зайшла размова аб дэлегатах Усебеларускага народнага сходу, то мы вырашылі, што прадстаўніцтва ад усіх арганізацый павінна быць роўнае. Цяпер гэта па 80 чалавек ад кожнай арганізацыі».

Па словах спікера, трэба працаваць з моладдзю. «Таму што яна, як губка, убірае ўсё. Калі ім чагосьці недакажаш, то яны будуць дадумваць самі або слухаць кагосьці іншага. Таму мы з імі шмат працуем, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Пры Нацыянальным сходзе створаны Маладзёжны савет. Там працуюць 138 маладых хлопцаў і дзяўчат. Калі ў першым скліканні ў складзе былі ў асноўным студэнты, то ў гэтым скліканні — людзі, якія ўжо працуюць. У іх ліку ёсць і ўрачы, якія ўносяць цікавыя прапановы».

**Паводле БелТА.**


Фота БелТА.

## Парламенцкі дзённік

# ПОЛЕ ДЗЕЙНАСЦІ РАЗМЕРКАВАНАЕ

### Сфарміраваны склад пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання


Фота БелТА.

**У склад:**

**Пастаяннай камісіі па заканадаўстве** увайшлі дэпутаты Аляксандр Амельянюк (намеснік старшыні), Андрэй Анісімаў, Ірына Астапенка, Анжаліка Курчак, Андрэй Ліс (намеснік старшыні), Марына Лянчэўская (старшыня), Мікалай Маратаеў, Юрый Марэцкі;

**Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце** — Віктар Азаронак, Наталля Аўсяннікава, Таццяна Лаўрыновіч, Ала Навуменка, Алена Патапава (намеснік старшыні), Валянціна Пух (намеснік старшыні), Валянцін Семяняка (старшыня);

**Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы** — Міхаіл Аксянюк, Аляксандр Барсукоў (намеснік старшыні), Анатоль Булаўка, Руслан Касыгін (намеснік старшыні), Андрэй Крупенькін, Генадзь Ляпешка (старшыня), Ігар Пашкоў, Руслан Шкодзін;

**Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы** — Руслан Вягера, Юлія Волкава, Вольга Жук, Дзяніс Карась (намеснік старшыні), Аляксандр Малабіцкі, Віктар Нікалайкін (старшыня), Анатоль Сіўко, Святлана Сакалоўская (намеснік старшыні);

**Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах** — Святлана Барташ (намеснік старшыні), Наталля Куляшова, Аляксандра Міхеенка (намеснік старшыні), Васіль Панасюк (старшыня), Аляксей Райко, Аляксандр Стома, Надзея Хальцова;

**Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы** — Андрэй Балыш (намеснік старшыні), Уладзімір Калеснікові, Юрый Корсік, Антон Кулісевіч (намеснік старшыні), Іван Маркевіч (старшыня), Кацярына Паздзяйкіна, Алена Пархімчык;

**Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні** — Уладзімір Бабічаў, Глеб Гулянкоў, Наталля Тарасенка (намеснік старшыні), Віталь Ракавец, Жанна Чарняўская (старшыня), Дзяніс Ушацкі, Алег Цылько (намеснік старшыні);

**Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі** — Мікалай Бузін (старшыня), Паліна Васілюк, Вадзім Гігін, Ірына Даўгала (намеснік старшыні), Аксана Кавалькова, Алег Раманаў (намеснік старшыні), Эдуард Севярын, Уладзімір Гаўрыловіч;

**Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы** — Вячаслаў Даніловіч (намеснік старшыні), Алена Клішэвіч, Сяргей Клішэвіч, Алег Кузьмін, Ігар Марзалюк (старшыня), Міхаіл Міронёчык, Аляксандр Сангін (намеснік старшыні), Алена Хаміцэвіч, Руслан Чарнецкі;

**Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях** — Іван Гардзейчык, Аксана Ількові, Ірына Касцевіч (старшыня), Аляксандр Канапацкі, Уладзімір Падабед, Святлана Сянько (намеснік старшыні), Георгій Хлябовіч, Ігар Шалудзін (намеснік старшыні);

**Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы** — Святлана Адзінцова, Наталля Дзяргач, Мікалай Кудзеньчук, Валерый Малашка (старшыня), Анастасія Міронечык-Іванова, Уладзімір Паўлоўскі, Вольга Сцепусь, Дзмітрый Шаўцоў (намеснік старшыні), Аляксандр Шыпула (намеснік старшыні);

**Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі** — Уладзімір Баравенка (намеснік старшыні), Сяргей Давыдаў, Антон Каранкевіч, Аляксандр Міхно, Юрый Панфілаў (старшыня), Аксана Прыходзька, Віталь Уткін (намеснік старшыні);

**Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве** — Аляксандр Вячорка (намеснік старшыні), Сяргей Казачок (намеснік старшыні), Алена Лапцева, Віктар Плескач, Анжаліна Сырамятнікава, Юрый Наркевіч (старшыня), Алена Хіля;

**Пастаяннай камісіі па міжнародных справах** — Галіна Бяляева, Алег Гайдукевіч (намеснік старшыні), Алег Дзячэнка (намеснік старшыні), Міхаіл Орда, Павел Папко, Сяргей Рачкоў (старшыня), Кацярына Серафіновіч, Аляксандр Шпакоўскі.

## Прафсаюзнае жыццё

# У ФПБ — новы старшыня

### У Мінску адбыўся IX (пазачарговы) з'езд Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

**Удзел у рабоце з'езда ўзялі каля 300 прадстаўнікоў прафсаюзных арганізацый з усёй краіны. Падчас пасяджэння старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі выбраны Юрый СЯНЬКО, які да гэтага займаў пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы (з 2020 года). Таксама па выніках з'езда былі выбраны 80 дэлегатаў УНС ад прафсаюзаў.**




Звяртаючыся да ўдзельнікаў мерапрыемства, **Міхаіл ОРДА, які ўзначальваў Федэрацыю прафсаюзаў да гэтага,** а цяпер з'яўляецца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, адзначыў, што выбранне дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу для прафсаюзаў — гэта пацвярджэнне іх аўтарытэту і значнасці ў грамадстве, а таксама магчымасць напрамую ўдзельнічаць у распрацоўцы і прыняцці стратэгічных рашэнняў па развіцці краіны. Ён акцэнтаваў увагу прысутных на рабоце прафсаюзаў па развіцці сацыяльнага партнёрства. Дзякуючы гэтаму ўжо сёння прафсаюзы могуць уплываць на заканатворчую дзейнасць у працоўнай і сацыяльнай сферах, што дае свае станоўчыя вынікі: па ініцыятыве прафсаюзных арганізацый прыняты шэраг заканадаўчых норм, якія пашыраюць гарантыі для працоўных. Сярод найбольш слушных — гарантыі па працягу кантрактаў на максімальны тэрмін для добрасумленных работнікаў, даванне падатковага выліку для маладых спецыялістаў, павышэнне памеру бальнічных для шэрагу катэгорый работнікаў і многія іншыя пытанні.

Важнасць прысутнасці прафсаюзаў на УНС падкрэсліў і Юрый Сянько. «Для ФПБ гэта быў вельмі складаны выбар (*выбранне 80 дэлегатаў.* — **«Зв.»**), бо амаль чатыры мільёны дастойных грамадзян нашай краіны з'яўляюцца членамі прафсаюзаў. У Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі ўваходзяць 15 галіновых прафсаюзаў. І надта важна было, каб у ліку дэлегатаў былі прадстаўнікі кожнага з іх. Мы зрабілі гэтую работу... Усе дэлегаты маюць працоўныя заслугі, а таксама вельмі актыўныя ў сваёй працоўнай дзейнасці. Яны не проста могуць добра выконваць свае абавязкі — яны ўмеюць яшчэ ініцыяваць пэўныя навелы, шукаць новыя рашэнні», — зазначыў нававыбраны старшыня ФПБ. І дадаў, што за 120-гадовую гісторыю Федэрацыя прафсаюзаў сабрала багатую спадчыну з цудоўнымі традыцыямі. Па яго словах, у сучасны перыяд паміж урадам, прафсаюзамі і наймальнікамі склалася надзвычай добрая практыка не спрэчак і барацьбы, а менавіта пошуку аптымальных рашэнняў напярэдадні прыняцця тых ці іншых нарматыўных актаў. Прафсаюзныя спецыялісты, юрысты, тэхнічныя інспектары напрамую ўзаемадзейнічаюць з Міністэрствам працы, заканадаўчымі органамі, пракуратурай і органамі юстыцыі ў пошуках правільных рашэнняў, каб не дапусціць ужо на стадыі прыёму і абмеркавання нарматыўнага акта якоганебудзь адхілення, што можа негатыўна адбіцца на становішчы работнікаў.

Гаворачы пра задачы, якія стаяць перад ФПБ, Юрый Сянько адзначыў: «**Першая задача** — гэта, вядома, работа з моладдзю. Сярод чатырох мільёнаў членаў прафсаюзаў вялікая колькасць моладзі — з ёю, праз пярвічныя ячэйкі, якіх больш за 24 тысячы, трэба працаваць. Аб'ядноўваючы маладых людзей і па працоўных пытаннях, і па пытаннях вольнага часу, захапленняў, прафсаюзы маюць у сваім распараджэнні вялікую інфраструктуру, якая дазваляе, у тым ліку, адпачыць нашым работнікам — членам прафсаюза. Гэта санаторыі, гасцініцы, турбазы, спартыўныя пляцоўкі рознага плана. Іншымі словамі, моладзі ёсць чым займацца.

**Другая** — падтрымка чалавека працы. Гэтая задача была, ёсць і застаецца найважнейшай. Вельмі важна нашаму работніку, члену прафсаюза, працаўніку вытворчасці не задумвацца над тым, ці ведае ён дакладна асновы працоўнага, грамадзянскага, адміністрацыйнага заканадаўства. Ён павінен выконваць свае працоўныя абавязкі. Задача і работа прафсаюзаў — абараніць яго інтарэсы, стварыць умовы без парушэнняў. І прафесійныя саюзы дастойна спраўляюцца з гэтай задачай, разглядаючы з наймальнікам усе пытанні па спосабах стварэння добрых умоў працы...

**Трэцяя задача для прафсаюзаў** — у кансалідацыі грамадства. І тут яны таксама на вышыні. Робіцца шмат і будуць працягваць гэта рабіць, каб стварыць грамадства, якое будзе ў адзіным парыве дасягаць агульнадзяржаўных мэт дзеля адзінства нашай нацыі і калектыву, займацца захаваннем традыцый нашай краіны, здароўя і жыцця працаўнікоў. І берагчы ўсе каштоўнасці, якія беларусы трапятліва захоўваюць для сябе і сваіх нашчадкаў: дзяцей, унукаў, праўнукаў. І, безумоўна, важная місія прафсаюзнага руху — гэта прадстаўленне нашай краіны і нашых прафсаюзаў на міжнароднай арэне. Тут шмат зроблена, але ў сучасным свеце — свеце прэтэнзій з боку краін калектыўнага Захаду, ЗША — з'яўляюцца неабходнасць і магчымасць, у тым ліку і ў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, выказваць сваё меркаванне, якое было, ёсць і будзе, у абарону нашых работнікаў, а таксама для захавання міжнародных дагавораў, прынятых раней і якія забяспечвалі правы працоўных і падтрымку на сусветнай арэне. Гэтую працу мы таксама працягнем».



У сваю чаргу, **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ** засяродзіў увагу ўдзельнікаў з'езда на тым, што работы будзе многа, бо цяпер занадта няпросты час. Ён выказаў упэўненасць у тым, што Юрый Сянько стане добрым пераемнікам Міхаіла Орды. «Упэўнены, што тэмп і вектар работы ФПБ, зададзеныя Міхаілам Сяргеевічам, паспяхова працягне і Юрый Аляксеевіч. Для гэтага ў яго ёсць неабходныя кампетэнцыі, працавітасць, вопыт, жаданне дапамагаць людзям», — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Таксама ён агучыў прыярытэтныя кірункі дзейнасці прафсаюзаў. «**Па-першае,** ахова інтарэсаў працоўных калектываў, недапушчэнне неабгрунтаванага скарачэння людзей і пераводу работнікаў на няпоўны працоўны дзень. Але, што самае галоўнае, сёння ідзе барацьба за чалавечыя рэсурсы. І адна з асноўных задач прафсаюзаў — гэта, вядома ж, падрыхтоўка нашай моладзі, мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў. Мы не павінны ўпусціць нашу моладзь, і задача прафсаюзаў у гэтым — вызначальная, — адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — **Другі кірунак** — кантраляванне выканання законаў, якія закранаюць эканамічныя і сацыяльныя інтарэсы працаўніка. **Трэці кірунак** — умацаванне станоўчага іміджу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне. Мы павінны знаходзіць ва ўсім свеце сяброў, партнёраў, тых, хто падтрымлівае нашы традыцыйныя каштоўнасці, наш суверэнітэт і незалежнасць. **Яшчэ адна задача,** якая стаіць перад прафсаюзамі, — пашырэнне прафсаюзнага руху: стварэнне прафсаюзных структур ва ўсіх арганізацыях краіны, нягледзячы на тое, прыватная яна ці дзяржаўная».

Галоўнай умовай вырашэння гэтых задач Ігар Луцкі назваў адзінства і падкрэсліў, што толькі разам мы захаваем суверэнітэт і незалежнасць краіны, даб'ёмся рэальных поспехаў у дабрабыце нашай дзяржавы. Немалую ролю ў гэтым павінны адыграць і дэлегаты УНС ад прафсаюзаў, якіх ён ахарактарызаваў як граматных і глыбока патрыятычных грамадзян нашай дзяржавы. «Менавіта вам, выбраныя дэлегаты, давядзецца адстойваць інтарэсы дзяржавы па самых важных і значных пытаннях. Упэўнены ў тым, што сярод выбраных — разумныя, пісьменныя і глыбока патрыятычныя грамадзяне нашай краіны», — зазначыў Ігар Луцкі.

**Паводле БелТА.**
**Фота БелТА.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ИООО «Газпромнефть – Белнефтепродукт», г. Минск, ул. Интернациональная, д. 36, пом. 2 (каб. 67, 6-й этаж). УНП 191118996 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Легковой автомобиль седан TOYOTA COROLLA,** рег. знак 9159 РХ-7, 2017 г. в. (инв. № 21293). Месторасположение: г. Борисов, ул. Зеленый городок, 2

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 45 000,00 бел. руб.** Шаг электронных торгов составляет 5 % от текущей цены предмета электронных торгов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **5 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.05.2024 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: по 07.05.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Частное торговое унитарное предприятие «Зеленый эдем», г. Гомель, ул. Бочкина, д. 195 |

**Предмет электронных торгов:**
**грузовой седельный тягач DAF XF 460 FT,** р/зн. АМ 6191-3, 2016 г. в.,
**полуприцеп фургон-рефрижератор SCHMITZ SK024,** р/зн. А 7619 А-3, 2007 г. в.
Местоположение: Минский р-н, п. Привольный, ул. Мира, 2а.
**Начальная цена с НДС 20 % – 230 000,00 бел. руб.**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 18.04.2024 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.04.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44)-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Нерудпром»** (Продавец)

Аукцион состоится **08.05.2024 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1 в составе: 1. Магазин, 209,1 кв. м** (инв. № 22327 согласно инв. карточке учета основных средств); **2. Оборудование** – счетчик электрической энергии CE 318 BY R32 146 JA UVFL (5-100).

Адрес: Минская обл., Минский р-н, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, 10А.
Начальная цена с НДС 20 % – 410 364,53 руб. Задаток – 40 000,00 руб.
Для обслуживания магазина выделен земельный участок 623680601101002955 площадью 0,0369 га.
Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания магазина.
Право аренды с 12.09.2023 по 17.07.2122. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 06.05.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ ОБ АУКЦИОНЕ
ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукциона:**
Мядельский сельисполком, тел.: (801797) 40735, 22352.
**День и время проведения аукциона: 7 мая 2024 г. в 14.00**
**Место проведения аукциона:**
**Минская обл., г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, к. 15**

**Лот № 1.** Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Гатовичи, РИЗ «Гатовичи», У-10, площадью 0,1284 га (кадастровый номер 624083103601000328), начальная цена – 43 000 руб.

**Лот № 2.** Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома в д. Никольцы, 106А, площадью 0,1792 га (кадастровый номер 624083107601000003), начальная цена – 50 000 руб.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by** (http://minsk-region.gov.by/dlya_delovykh_lyudey/auktsiony/), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** (http://gki.gov.by/ru/auction/), Мядельского районного исполнительного комитета (myadel.gov.by).
УНП 600380436

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ
*Организатор: Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска», 220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685*

**Торги проводятся 06.05.2024 г. ЭТП «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by.**

**Л/АВТОМОБИЛЬ GEELY SC7,**
**2014 г., черный – 11600 BYN**

Окончание приема заявлений – **30.04.2024, до 15.00.**
Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**
УНП 192605364

Утерянный страховой полис 1СУ Квитанция о приеме наличных денежных средств серии ВА, № 8800988, в представительстве Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным**.
УНП 100122726

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об отмене аукциона,** назначенного на 11.04.2024 г. по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу филиал «Центральный рынок», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55.
УНП 590959404

# ЛАГІСТЫ І КАНФЛІКТОЛАГІ. МІЖНАРОДНЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Алена Анатольеўна, наколькі складана адкрываць навучанне па новых спецыяльнасцях? Адкуль прыйшло рашэнне?***

— З жыцця, бягучай сітуацыі, з патрэб эканомікі нашай краіны. Адкрыць новую спецыяльнасць для навучання — не такая простая справа, як можа падацца. Гэта доўгія абмеркаванні і неабходнасць у новых спецыялістах. Перад тым, як падаць заяўку ў Міністэрства адукацыі, мы збіралі меркаванні ад арганізацый, якія могуць стаць заказчыкамі кадраў. На спецыяльнасць «Міжнародная лагістыка» быў проста бум, мы атрымалі вельмі шмат заявак. Вялікую зацікаўленасць выклікала і спецыяльнасць «Міжнародная канфліктагогія». Напрыклад, ад нашага ваеннага ведамства.

***— Сёння спецыялістаў па лагістыцы рыхтуюць некалькі ВНУ Беларусі. Што такое асаблівае ёсць у вас, чаго няма ў іншых універсітэтах?***

— ФМА — адзіны ў нашай краіне, хто будзе рыхтаваць запатрабаваных сёння спецыялістаў міжнароднага ўзроўню.

***— І якія патрабаванні да выпускнікоў факультэта ў сувязі з гэтым прад'яўляюцца?***

— Перш за ўсё гэта кампетэнцыі ва ўзаемазвязаных сферах міжнародных адносін, права, лагістыкі, сусветнай эканомікі, менеджменту, усходазнаўства і асваенне практыкі вядзення перагавораў і дзелавой перапіскі на замежных мовах. Заказчыкі кадраў ужо прадставілі нам пералік найбольш актуальных з іх сёння. Гэта кітайская, турэцкая, арабская, фарсі і нават хіндзі. Пры гэтым мы не адмовімся і ад еўрапейскіх моў.

Калі працягнуць аб перавагах нашага факультэта, то адной з бясспрэчных з'яўляюцца суадносіны выкладання па спецыяльнасці і замежных мовах. Дысцыпліны па спецыяльнасці ў нас займаюць 55 працэнтаў навучальнага працэсу. Астатнія 45 — дысцыпліны па замежных мовах. Спалучэнне падрыхтоўкі па спецыяльнасці і па дзвюх замежных мовах — свайго роду канкурэнтная перавага факультэта міжнародных адносін.

***— Колькі моў у цэлым выкладаецца на ФМА?***

— Шаснаццаць. Але гэта не значыць, што студэнт можа прыйсці і абраць адну з гэтай колькасці. У сёлетнюю ўступную кампанію на розныя спецыяльнасці мы будзем прапаноўваць каля дзесяці моў, прычым на ўсіх спецыяльнасцях без



Дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ Алена ДАСТАНКА.

выключэння ў якасці першай мовы будзе кітайская.

***— Канфліктолаг — спецыяльнасць для нас, ды і для вас, новая. Але, мяркуючы па тым, як развіваюцца падзеі ў свеце, для сучасных умоў актуальная. Абітурыентам будзе цікава ведаць, якія перспектывы для іх яна можа адкрыць.***

— Гэта ўнікальная спецыяльнасць. І будзе запатрабавана асабліва сёння, у рэаліях глабальных сутыкненняў і выклікаў. Канфліктолаг будзе атрымліваць веды значна шырэй, чым проста спецыяліст па міжнародных адносінах. Ён закліканы займацца міжнароднымі канфліктамі. І гэта зусім іншая сфера, чым вырашэнне сямейных, калектыўных ці нават рэгіянальных канфліктаў.

Спецыяліст-канфліктолаг павінен разбірацца ў дыпламатыі, псіхалогіі, ведаць геаграфію краін і іх этнас, асаблівасці культуры. У гэтай прафесіі не бывае дробязяў, важна ўсё. Уявіце: прыязджаеце вы на буйную міжнародную канферэнцыю, дзе больш за сотню прадстаўнікоў розных краін. Трэба разумець, як з імі ўзаемадзейнічаць, бо кожная краіна, кожная нацыянальнасць маюць свае асаблівасці. Калі разам збіраецца столькі розных людзей, могуць узнікнуць рознагалоссі, спрэчкі. Аднабаковых канфліктаў не бывае, заўсёды ёсць два бакі, адзін з якіх — рухавік канфлікту. І ў гэтым трэба разбірацца. Як падысці, якую весці размову і гэтак далей. Узяць такі момант, як цырымонія прывітання. У большасці дзяржаў жанчына карыстаецца правам падачы рукі першай. У арабскім свеце гэта забаронена пратаколам.

Мы будзем вучыць студэнтаў рэгуляваць канфлікты з дапамогай медыятыўных тэхналогій, падтрымліваць светапарадак з дапамогай перагавораў і пасрэдніцтва, навучаць навыкам дыпламатыі.

Канфлікты здараюцца не толькі паміж людзьмі і краінамі. Існуюць супрацьстаянне людзей і прыроды, тэхнагенныя катастрофы, эпідэміі. Гэта таксама з'яўляецца сферай дзейнасці спецыялістаў па міжнароднай канфліктагогіі. Таму, апроч сваіх прафесійных якасцяў, людзі гэтай прафесіі павінны быць маральна і фізічна ўстойлівымі. Улічваючы гэта, у навучальныя планы мы змясцілі такія дысцыпліны, як ваенная справа і асновы медыцынскіх ведаў. Акрамя таго, на факультэце даволі моцны блок псіхалагічных дысцыплін, з якімі нам дапамагаюць калегі — выкладчыкі профільных факультэтаў і кафедраў.

***— Які конкурс чакаецца па новых спецыяльнасцях?***

— На нашым факультэце традыцыйна высокія конкурсы. У 2023 годзе, напрыклад, на «Міжнароднае права» на бюджэт у нас быў прахадны бал 398. На «Сусветную эканоміку» — 382, «Міжнародны турызм» — 382, «Мытная справа» — 373, «Усходазнаўства» — 390, «Міжнародныя адносіны» — 393.

Паступленне на факультэт вядзецца толькі па сертыфікатах, балы якіх падсумоўваюцца з балам атэстата. На эканамічныя спецыяльнасці гэта «Сусветная эканоміка», «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму», «Міжнародная лагістыка» і «Мытная справа», абітурыенты будуць здаваць матэматыку, замежную мову і рускую (беларускую) мову. А на такія спецыяльнасці, як «Міжнароднае права», «Міжнародныя адносіны», «Міжнародная канфліктагогія» і «Усходазнаўства» — грамадазнаўства, замежная і руская (беларуская) мовы.

***— Узровень сур'ёзны. Але ў выніку вы і атрымліваеце падрыхтаваных першакурснікаў, з якімі ў далейшым будзе лёгка працаваць.***

— Не забывайце яшчэ і першапачаткова матываваных мэтавых абітурыентаў. Што да лёгка/цяжка... З дзецьмі, якія прыйшлі вучыцца з такімі высокімі баламі, — не тое, што цяжка, — з імі трэба ўмець працаваць. Патрэбны асаблівыя падыходы, вялікая дысцыплінаванасць выкладчыкаў, каб не допускаць няведання нейкіх рэчаў. У нас, як і ўсюды, ёсць розныя сітуацыі. Непарушным застаецца адно: зместу адукацыі выкладчыцкі склад аддае шмат часу і ўвагі.

Мы перагледзелі навучальныя праграмы па ўсіх спецыяльнасцях, дысцыплінах, асабліва па актуальных. У выніку сур'ёзна памяняўся іх змест па міжнародных адносінах, міжнародным праве.

***— Метадычныя дапаможнікі, падручнікі паспяваеце мяняць?***

— У гэтым годзе мы выдалі падручнік па міжнародным праве. Гэта вялікае дасягненне, бо працэс складаны і доўгі. Але ў нас ёсць добры электронны рэсурс — адукацыйны партал БДУ, якім паспяхова карыстаюцца выкладчыкі і студэнты.

***— Некалькі слоў аб прафесарска-выкладчыцкім складзе факультэта.***

— Гэта яшчэ адна наша асаблівасць. Сярод выкладчыкаў ёсць тыя, хто займаў дыпламатычныя пасады ў нашай краіне ў розны час. Па магчымасці запрашаем практыкаў з Міністэрства замежных спраў, Дзяржаўнага мытнага камітэта, Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Міністэрства эканомікі, Нацыянальнага агенцтва па турызме, міжнародных лагістычных арганізацый. Для выкладання дысцыпліны «Практыка міжнароднага бізнесу» запрашаюцца спецыялісты, якія асвятляюць розныя аспекты міжнароднага бізнесу. Частымі гасцямі ў нас бываюць і рэзідэнты «Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Такія лекцыі, з выкладчыкамі-практыкамі, нашы студэнты слухаюць з асаблівай увагай, я нават сказала б з задавальненнем.

З другога курса для студэнтаў ФМА арганізоўваюцца навучальныя, моўныя і вытворчыя практыкі па-за БДУ. Істотны ўклад у фарміраванне кампетэнцый студэнтаў уносяць рэгулярныя сустрэчы з дзяржаўнымі і палітычнымі дзеячамі Рэспублікі Беларусь, краін-партнёраў, дзеячамі навукі, культуры і мастацтва. Рэалізоўваюцца дыялогавыя пляцоўкі «Беларусь — свету», «Размова з міністрам», кейс-чэмпіянат БДУ па міжнароднай праблематыцы.

***— Дзе будуць працаваць, менавіта будуць, а не могуць, выпускнікі па новых спецыяльнасцях?***

— Асноўнымі заказчыкамі выступілі Міністэрства замежных спраў і Міністэрства абароны, Дзяржаўны мытны камітэт, РУП «Белмытсэрвіс», «Джэнці спедышн» і іншыя арганізацыі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота з архіва факультэта.**

З нагоды

# Дыягназ для беларусаў

## Заўтра — Сусветны дзень здароўя

**Адметна, што, паводле апытанняў, пераважная большасць беларусаў — звыш 90 % — ацэньвае стан свайго здароўя як добры і здавальняльны. Павялічваецца колькасць тых, хто зрабіў заняткі фізкультурай і спортам часткай свайго жыцця. А вось забяспечанасць медыкамі ў нашай краіне вышэй, чым у такіх краінах Заходняй Еўропы, як Іспанія, Італія, Нідэрланды, Аўстрыя і інш. Нацыянальны статыстычны камітэт напярэдадні Сусветнага дня здароўя падзяліўся цікавымі лічбамі.**

У Беларусі функцыянуюць 1394 амбулаторна-паліклінічныя арганізацыі, 558 бальніц, 70 818 бальнічных ложкаў кароткатэрміновага знаходжання. Працуюць 112 493 сярэднія медыцынскія работнікі і 41 256 практыкуючых урачоў.

Забяспечанасць медыкамі ў Беларусі складае 45,1 урача і 122,9 сярэдняга медыцынскага работніка на 10 тысяч чалавек. Забяспечанасць урачамі ў нашай краіне вышэй, чым у такіх краінах, як Іспанія (44,9), Літва (44,7), Балгарыя (43), Італія (42,5), а сярэднімі медыцынскімі работнікамі — у параўнанні з Нідэрландамі (113,3), Аўстрыяй (107,6), Славеніяй (106,1), Чэхіяй (90,6).

У 2023 годзе колькасць наведванняў урачоў на амбулаторным прыёме і ўрачамі на доме склала 108,4 мільёна. У разліку на аднаго пацыента гэта 11,8 наведвання за год. Па даных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак на пачатак 2024 года сваё здароўе 93,1 % беларусаў ацэньваюць як добрае і здавальняльнае. Прытым мужчыны ў гэтым плане крыху больш аптымістычныя (93,4 % мужчын супраць 92,9 % жанчын).

Беларусы актыўней пачалі займацца спортам. У параўнанні з 2010 годам колькасць тых, хто практыкуе тую ці іншую фізічную нагрузку, вырасла з 22,9 % да 28,8 %. І тут тон задаюць жанчыны: іх актыўная частка вырасла з 22,5 % у 2010-м да 31,5 % у 2024-м. Колькасць мужчын, якія выбіраюць спорт, вырасла нязначна — з 23,5 % да 24,6 % за 14 гадоў.

Самай актыўнай узроставай катэгорыяй з'яўляецца моладзь ва ўзросце ад 16 да 29 гадоў: тут заняткі фізкультурай і спортам абавязковыя ў 53,4 %. Далей беларусы становяцца ўсё менш актыўнымі: ва ўзросце ад 30 да 44 гадоў спортам займаюцца 26,2 %, ва ўзросце 45—59 гадоў — 23,1 %. Пасля 60 актыўнасць крыху павялічваецца. Фізічная актыўнасць прысутнічае ў якасці абавязковых заняткаў у 27,7 % пажылых людзей.

Трэба сказаць, што спартыўных пляцовак, дзе кожны можа знайсці занятак па душы, у нашай краіне нямала. На канец мінулага года ў краіне функцыянавала больш чым 23 тысячы фізкультурна-спартыўных збудаванняў, у тым ліку 56 спартыўных манежаў, 178 стадыёнаў, 4523 спартыўныя залы, 366 плавальных басейнаў, 349 хакейных каробак, 537 стралковых тыраў, 405 адкрытых тэнісных кортаў. У Беларусі працуе 436 спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў, дзе займаюцца 151 965 выхаванцаў. А таксама 11 вучылішчаў алімпійскага рэзерву, дзе навучаюцца 3 283 спартсмены.

Створаны ў краіне і ўсе магчымасці для аздараўлення. Летась у 462 санаторна-курортных, аздараўленчых арганізацыях і іншых спецыялізаваных сродках размяшчэння адпачылі і аздараравіліся 1026 чалавек (на 9,8 % больш, чым у 2022-м). З іх 81,6 % беларусаў і 18,4 % замежнікаў. У тым ліку ў 75 санаторыях адпачылі і аздараравіліся 542,6 тысячы чалавек (на 5,8 % больш, чым у 2022-м), з іх 71 % беларусаў і 29 % замежнікаў.

Усяго ж летась медыцынскія паслугі ў нашай краіне атрымалі замежнікі са 147 краін свету. У топ-5 краін, адкуль у Беларусь едуць па медыцынскую дапамогу, — Расія, Казахстан, Латвія, Боснія і Герцагавіна і Кітай.

**Алена КРАВЕЦ.**

# СЭРЦЫ ПАД ЗЯМЛЁЙ

**Пасёлак Бягомль Докшыцкага раёна — адзін з тых нявлікіх населеных пунктаў, які ўзнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Унікальны выпадак выратавання 30 чалавек, якія 18 дзён правялі пад зямлёй, таксама ўвайшоў у гэты гераічны летапіс.**

Партызанскі рух у Бягомльскім раёне (ён існаваў да 1960 года) пачаў зараджацца з першых дзён вайны па ініцыятыве мясцовага жыхара Сцяпана Манковіча. Ён стаў камісарам атрада «Рамана», на аснове якога ў верасні 1942 года была сфарміравана самая вядомая партызанская брыгада ваеннага часу «Жалязняк».

Задачай партызан было ўзяць пад кантроль дарогі, якія вялі праз Бягомль на фронт, а таксама ў тыл да чыгуначных станцый. У зоне дзеяння Барысаўскага міжраённага партызанскага цэнтра народныя мсціўцы павінны былі паралізаваць дзейнасць каля 40 фашысцкіх гарнізонаў. Ужо 17 снежня 1942 года пачаўся заключны этап аперацыі па вызваленні раёна, да лета 1944-га Бягомль быў вызвалены поўнасцю і губляў сваю незалежнасць толькі падчас буйных карных аперацый.

На тэрыторыі БССР Бягомльскі раён стаў адным з першых савецкіх раёнаў у тыле ворага, а пасёлак неафіцыйна атрымаў статус сталіцы самай вялікай на тэрыторыі СССР Барысава-Бягомльскай партызанскай зоны.

Вялікую ролю ў вызваленні пасёлка адыграў аэрадром, які пабудавалі за некалькі гадоў да пачатку вайны, але скарыстацца ім у мірны час мясцовыя жыхары не паспелі. Партызанскі аэрадром пачаў дзейнічаць адразу пасля вызвалення Бягомля, з сакавіка 1943 года адсюль выпраўлялі цяжкапараненых партызан амаль кожную ноч, сюды дастаўлялі грузы не толькі для «жалязнякоўцаў», але і для іншых раёнаў і абласцей. Да чэрвеня 1944 года адсюль эвакуіравалі тысячы параненых байцоў і дзяцей, адсюль дастаўлялі і знакамітую разведчыцу Алену Мазанік, якая пасля забойства Вільгельма Кубэ была названа асабістым ворагам Гітлера.

Самай страшнай старонкай у гісторыі пасёлка стала адна з найбуйнейшых карных аперацый «Котбус», якая пачалася 15 мая 1943 года. Знішчыць удзельнікаў партызанскага руху Барысава-Бягомльскай зоны немцы планавалі за 10 дзён, аднак аперацыя расцягнулася на шэсць тыдняў. Вёска Шунеўка стала вогненнай сястрой Хатыні, у ёй 22 мая 1943 года немцы знішчылі 66 жыхароў, 15 з якіх былі дзецьмі. Сёння мемарыял, што быў створаны на месцы трагедыі, з'яўляецца месцам горкай памяці і смутку для ўсіх жыхароў краіны.

Апошняя буйная карная аперацыя «Карнаран», па выніках якой немцы імкнуліся знішчыць партызан у Дамжэрыцкіх балотах, адбылася летам 1944 года. Народныя мсціўцы не паспелі эвакуіраваць на Вялікую зямлю каля 30 параненых і хворых на тыф. Тады партызаны зрабілі неверагоднае: у раёне вёскі Саўскі Бор (сёння гэта тэрыторыя Бярэзінскага біясфернага запаведніка) сярод балот яны вырылі дзве зямлянкі і схавалі там людзей разам з медсёстрамі і санітаркамі.

Падпольны шпіталь, які 18 дзён і начэй хаваў параненых, сёння з'яўляецца не толькі сімвалам бяскрайняй мужнасці і стойкасці, але і адным з тых складнікаў, якія прынеслі савецкаму народу Перамогу. Дзесяць метраў у даўжыню, два ў шырыню і метр у вышыню — перамяшчацца медработнікі маглі толькі ў скурчаным становішчы. Планавалася, што людзі правядуць пад зямлёй усяго некалькі дзён, але ім давялося выжываць амаль тры тыдні. Заканчваліся вада і ежа; паветра, якое цыркулявала праз адтуліну ў пні, часта перабівалася, бо зверху вентыляцыя засыпалася пяском. Але зямлянкі партызаны замаскіравалі так умела, што вораг хадзіў па версе і не здагадваўся, што проста пад нагамі, пад зямлёй, стогнуць у трызненні савецкія байцы.



| 16 | Плитка мощения Глушковичский, 0,78 м2; Плитка мощения Глушковичский, 0,55 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,96 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,76 м2; Плитка мощения Возрождение, 0,49 м2; Плитка мощения, 1 м2; Плитка мощения Балтик Грин, 1,82 м2; Плитка мощения Микашевичский, 1,12 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,91 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,42 м2; Плитка мощения Глушковичский, 0,91 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,66 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,69 м2; Плитка мощения Балтик Грин, 0,6 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,2 м2; Плитка мощения Балтик Грин, 1,59 м2 | 2 870,36 | 287,04 | 143,52 |
| 17 | Плитка мощения Микашевичский, 1,04 м2; Плитка мощения Ореховский, 1,1 м2; Плитка мощения Микашевичский, 1 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,84 м2; Плитка мощения Микашевичский, 1,08 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,7 м2; Плитка мощения Микашевичский, 1,2 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,96 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,96 м2; Плитка мощения Микашевичский, 1,06 м2; Плитка мощения Ореховский, 0,84 м2; Плитка мощения Микашевичский, 1,2 м2; Плитка мощения Ореховский, 1,32 м2; Плитка мощения Ореховский, 1,06 м2; Плитка мощения Глушковичский, 1,14 м2; Плитка мощения Глушковичский, 1,1 м2; Плитка мощения Глушковичский, 1,01 м2; Плитка мощения Глушковичский, 1,24 м2; Плитка мощения Ореховский, 1,16 м2; Плитка мощения Куру Грей, 1,2 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,05 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,7 м2 | 2 769,95 | 276,99 | 138,50 |
| 18 | Плитка разнофор. Мансуровский, 0,35 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 0,72 м2; Плитка разнофор. Лабрадорит, 1,2 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 0,4 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 0,75 м2; Плитка разнофор. Янцевский, 0,63 м2; Плитка разнофор. Янцевский, 1,12 м2; Плитка разнофор. Габбро-Диабаз, 1,02 м2; Плитка разнофор. Мансуровский, 0,78 м2; Плитка разнофор. Глушковичский, 0,3 м2; Плитка разнофор. Мансуровский, 0,72 м2; Плитка разнофор. Габбро-Диабаз, 1,03 м2; Плитка разнофор. Балтийский, 0,73 м2; Плитка разнофор. Габбро-Диабаз, 0,46 м2; Плитка разнофор. Янцевский, 0,64 м2; Плитка разнофор. Лабрадорит, 1,3 м2; Плитка разнофор. Янцевский, 0,82 м2; Плитка разнофор. Мансуровский, 0,77 м2; Плитка разнофор. Куру Грей, 0,45 м2; Плитка разнофор. Куру Грей, 0,8 м2; Плитка разнофор. Балтик Браун, 0,76 м2 | 3 354,45 | 335,45 | 167,72 |
| 19 | Плита цокольная Габбро-Диабаз, 0,96 м2; Плита цокольная Габбро-Диабаз, 0,98 м2; Плита цокольная Балтик Браун, 1,92 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,79 м2; Плита цокольная Капустинский, 0,48 м2; Плита цокольная Межиричский, 0,2 м2; Плита цокольная Межиричский, 2,3 м2; Плита цокольная Тигровый, 0,98 м2; Плита цокольная Балтик Грин, 0,54 м2; Плита цокольная Балтик Грин, 1,12 м2; Плита цокольная Межиричский, 0,91 м2 | 2 558,34 | 255,83 | 127,92 |
| 20 | Плиты цокольные согласно списку № 7: https://docs.google.com/document/d/19aNYt4fwqoTYtdBj6pJ95CbZGuHt5sxh/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 3 808,89 | 380,89 | 190,44 |
| 21 | Плитка облиц. Балтийский, 1 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,91 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,84 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,84 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,75 м2; Плитка облиц. Покостовский, 7,53 м2; Плитка облиц. Покостовский, 1,33 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,96 м2 | 2 760,60 | 276,06 | 138,03 |
| 22 | Плитка облиц. Возрождение, 0,36 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,6 м2; Плитка облиц. Возрождение, 6,48 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,65 м2; Плитка облиц. Возрождение, 1,33 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,51 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,09 м2; Плитка облиц. Возрождение, 7,13 м2; Плитка облиц. Возрождение, 4,08 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,27 м2; Плитка облиц. Возрождение, 6,5 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,99 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,25 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,33 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,67 м2; Плитка облиц. Возрождение, 1,26 м2; Плитка облиц. Возрождение, 1,1 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,96 м2 | 6 444,97 | 644,50 | 322,25 |
| 23 | Плита цокольная Возрождение, 5,25 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,43 м2; Плита цокольная Возрождение, 3,48 м2; Плита цокольная Возрождение, 3,48 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,41 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,17 м2; Плита цокольная Возрождение, 4,75 м2; Плита цокольная Возрождение, 1,08 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,2 м2; Плита цокольная Возрождение, 3,17 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,49 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,98 м2; Плита цокольная Возрождение, 2,5 м2; Плита цокольная Возрождение, 1,7 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,14 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,1 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,08 м2 | 5 454,00 | 545,40 | 272,70 |
| 24 | Плитка облиц. Янцевский, 0,68 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,73 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,21 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,21 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,23 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,96 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,8 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,09 м2; Плитка облиц. Симоновский, 4,27 м2; Плитка облиц. Симоновский, 5,6 м2 | 2 418,69 | 241,87 | 120,93 |
| 25 | Плитка облиц. Мансуровский, 0,72 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,84 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,87 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 1,2 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 1,3 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,96 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 9,67 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 7,67 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,84 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,84 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,98 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 1,84 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 2,52 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,4 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,99 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,14 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 2,5 м2 | 8 551,62 | 855,16 | 427,58 |
| 26 | Плиты согласно списку № 8: https://docs.google.com/document/d/1fbECFUlC6vSqXpN9OoKRUR8tetbX4tul/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 4 691,18 | 469,12 | 234,56 |
| 27 | Балясина Возрождение, 13 шт. | 6 864,00 | 686,40 | 343,20 |
| 28 | Балясина Возрождение, 13 шт. | 6 864,00 | 686,40 | 343,20 |
| 29 | Балясина Мрамор, 15 шт. | 7 920,00 | 792,00 | 396,00 |
| 30 | Балясина Лабрадорит, 20 шт. | 10 560,00 | 1 056,00 | 528,00 |
| 31 | Балясина Гранатовый амф., 20 шт. | 10 560,00 | 1 056,00 | 528,00 |
| 32 | Балясина Гранатовый амф., 20 шт. | 10 560,00 | 1 056,00 | 528,00 |
| 33 | Балясина Гранатовый амф., 18 шт. | 9 504,00 | 950,40 | 475,20 |
| 34 | Балясина Лезниковский, 13 шт. | 6 864,00 | 686,40 | 343,20 |
| 35 | Балясина Габбро-Диабаз, 21 шт. | 11 088,00 | 1 108,80 | 554,40 |
| 36 | Балясина Габбро-Диабаз, 16 шт. | 8 448,00 | 844,80 | 422,40 |
| 37 | Плита цокольная Межиричский, 0,02 м2; Плита цокольная Межиричский, 0,14 м2; Плита цокольная Межиричский, 0,88 м2; Плита цокольная Межиричский, 0,46 м2; Плита цокольная Межиричский, 1,88 м2; Плита цокольная Симоновский, 0,75 м2; Плита цокольная Токовский, 0,07 м2; Плита цокольная Токовский, 0,06 м2 | 571,48 | 57,15 | 28,57 |
| 38 | Плита цокольная Мансуровский, 0,72 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,66 м2; Плита цокольная Мансуровский, 1,87 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,84 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,01 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,72 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,96 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,88 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,52 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,14 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,12 м2; Плита цокольная Мансуровский, 4,88 м2; Плита цокольная Мансуровский, 1,72 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,37 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,72 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,35 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,12 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,12 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,18 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,31 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,3 м2 | 4 117,34 | 411,73 | 205,87 |
| 39 | Блок Мансуровский, 2,85 м2; Блок Мансуровский, 0,2 м2; Блок Мансуровский, 0,2 м2; Блок Куру Грей, 1 м2; Блок Куру Грей, 1,2 м2; Блок Куру Грей, 0,6 м2; Блок Яшма, 0,72 м2 | 2 796,63 | 279,66 | 139,83 |
| 40 | Блок Балморал Ред, 1,96 м2; Блок Балморал Ред, 1,68 м2; Блок Балморал Ред, 0,45 м2; Блок Балморал Ред, 0,7; Блок Балморал Ред, 0,99 м2; Блок Балморал Ред, 4,05 м2; Блок Балморал Ред, 2,28 м2; Блок Балморал Ред, 4,05 м2; Блок Балморал Ред, 2,28 м2; Блок Балморал Ред, 1,8 м2; Блок Балморал Ред, 1,32 м2 | 8 899,97 | 890,00 | 445,00 |
| 41 | Блок Межиричский, 0,48 м2; Блок Межиричский, 2,6 м2; Блок Межиричский, 0,51 м2; Блок Межиричский, 0,17 м2; Блок Капустинский, 0,06 м2; Блок Балтик Браун, 0,03 м2 | 1 587,84 | 158,78 | 79,39 |
| 42 | Балясина Мансуровский, 18 шт. | 9 504,00 | 950,40 | 475,20 |
| 43 | Балясина Возрождение, 20 шт. | 10 560,00 | 1 056,00 | 528,00 |
| 44 | Балясина Амадеус, 15 шт. | 7 920,00 | 792,00 | 396,00 |
| 45 | Тумбы согласно списку № 9: https://docs.google.com/document/d/1MPKJKwHLE-pPAuV-odh9V92QziGlrklI/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1 050,89 | 105,09 | 52,54 |
| 46 | Цветники согласно списку № 10: https://docs.google.com/document/d/1ihwA9VJzTK1Uwi3y4NIM4ecXWHDsmxlI/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 5 775,98 | 577,60 | 288,80 |
| 47 | Плитка мощения Межиричский, 1,22 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,68 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,9 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,19 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,16 м2; Плитка облиц. Межиричский, 1,32 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,6 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,4 м2; Плитка мощения Межиричский, 0,81 м2; Плитка мощения Межиричский, 1,44 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,5 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,68 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,14 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,04 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,04 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,2 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,94 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,72 м2 | 2 951,74 | 295,17 | 147,59 |
| 48 | Имущество согласно списку № 11: https://docs.google.com/document/d/1VRyPch8KaislIPfabdccBe3W9o4G4gs6/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 4 278,16 | 427,82 | 213,91 |
| 49 | Крест, 1,52 м2; Крест, 1,4 м2; Крест, 1,08 м2 | 7 680,00 | 768,00 | 384,00 |
| 50 | Надгробные плиты согласно списку № 12: https://docs.google.com/document/d/1yzrSmv0xX7G5_BKY1cK5r5lAKzXNWXDN/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 5 850,82 | 585,08 | 292,54 |
| 51 | Мрамор, 2,02 м2; Мрамор, 2,52 м2; Другая геометрия Мрамор, 0,13 м2; Подоконник Мрамор, 1,49 м2; Плитка облиц. Мрамор, 1,1 м2; Другая геометрия Мрамор, 5,6 м2; Другая геометрия Мрамор, 5,6 м2 | 4 606,20 | 460,62 | 230,31 |
| 52 | Слэб Возрождение, 2,34 м2; Слэб Возрождение, 1,02 м2; Слэб Возрождение, 0,34 м2; Слэб Возрождение, 0,12 м2; Слэб Возрождение, 2,24 м2; Слэб Возрождение, 0,81 м2; Слэб Возрождение, 0,6 м2; Слэб Возрождение, 1,42 м2; Слэб Возрождение, 1,92 м2; Слэб Возрождение, 1,43 м2; Слэб Возрождение, 1,2 м2 | 2 580,79 | 258,08 | 129,04 |
| 53 | Слэб Янцевский, 1,92 м2; Слэб Балморал Ред, 0,84 м2; Слэб Габбро-Диабаз, 0,71 м2; Слэб Габбро-Диабаз, 0,36 м2; Слэб Мансуровский, 0,91 м2; Слэб Мансуровский, 1,17 м2; Слэб Мансуровский, 1,92 м2; Слэб Балтик Грин, 3,64 м2; Слэб Песчаник, 2,16 м2; Слэб Песчаник, 3,36 м2; Слэб Покостовский, 1,89 м2; Слэб Покостовский, 1,4 м2; Слэб Возрождение, 1,33 м2 | 4 392,62 | 439,26 | 219,63 |
| 54 | Другая геометрия Капустинский, 0,74 м2; Другая геометрия Возрождение, 1,04 м2; Другая геометрия Капустинский, 1,23 м2; Валун, 1,46 м2; Валун, 2,43 м2; Валун, 2,43 м2; Валун, 1,79 м2; Валун, 1,21 м2 | 1 013,05 | 101,30 | 50,65 |
| 55 | Плитка мощения Габбро-Диабаз, 1,28 м2; Плитка мощения Покостовский, 0,77 м2; Плитка мощения Покостовский, 1,91 м2; Плитка мощения Габбро-Диабаз, 1,05 м2; Плитка мощения Покостовский, 1,08 м2; Плита цокольная Лабрадорит, 0,16 м2; Плита цокольная Габбро-Диабаз, 0,08 м2; Плита цокольная Габбро-Диабаз, 0,15 м2; Плита цокольная Аврора, 1,56 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 0,96 м2; Плита цокольная Емельяновский, 0,96 м2; Плитка мощения Возрождение, 0,96 м2; Плитка мощения Возрождение, 0,96 м2; Плитка мощения Возрождение, 0,96 м2; Плитка мощения Балморал Ред, 0,14 м2; Плитка мощения Возрождение, 0,56 м2; Плитка мощения Покостовский, 1,02 м2 | 4 009,95 | 400,99 | 200,50 |
| 56 | Борт Покостовский, 50 м.п.; Борт Возрождение, 3,26 м.п.; Борт Балморал Ред, 5 м.п.; Борт Янцевский, 7,2 м.п. | 5 215,85 | 521,59 | 260,79 |
| 57 | Плитка облиц. Габбро-Диабаз, 0,88 м2; Плитка облиц. Габбро-Диабаз, 0,12 м2; Плитка облиц. Межиричский , 0,8 м2; Плитка облиц. Балтик Браун, 4,25 м2; Плитка облиц. Балтик Грин, 0,55 м2; Брусчатка Мансуровский, 0,72 м2; Плитка облиц. Капустинский, 0,9 м2; Плитка облиц. Дидковский, 1,04 м2; Плитка облиц., 0,96 м2; Плитка облиц. Песчаник, 0,84 м2 | 2 699,09 | 269,91 | 134,95 |
| 58 | Плитка разнофор. Елизовский, 0,38 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 1,08 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 0,78 м2; Плитка разнофор. Мансуровский, 1,04 м2; Плитка разнофор. Балморал Ред, 1,07 м2; Плитка разнофор. Мансуровский, 1,04 м2; Плитка разнофор. Янцевский, 0,41 м2; Плитка разнофор. Куру Грей, 1,35 м2; Плитка разнофор. Лабрадорит, 1,2 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 0,7 м2; Плитка разнофор. Капустинский, 1,04 м2; Плитка разнофор. Балтик Грин, 0,78 м2; Плитка разнофор. Капустинский, 1,17 м2 | 2 855,23 | 285,52 | 142,76 |
| 59 | Брус Мансуровский, 0,3 м2; Брус Возрождение, 0,27 м2; Брус Возрождение, 0,06 м2; Брус Балморал Ред, 27,45 м2; Брус Габбро-Диабаз, 0,34 м2; Брус Возрождение, 0,24 м2; Брус Возрождение, 0,21 м2 | 7 333,25 | 733,32 | 366,66 |
| 60 | Плита цокольная Покостовский, 0,96 м2; Плита цокольная Лабрадорит, 0,8 м2; Плита цокольная Покостовский, 0,14 м2; Плита цокольная Емельяновский, 0,04 м2; Плита цокольная Емельяновский, 0,49 м2; Плита цокольная Емельяновский, 0,04 м2; Плита цокольная Балтик Браун, 0,04 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 1,12 м2; Плита цокольная Гранатовый амф., 0,27 м2; Плита цокольная Покостовский, 2,2 м2; Плита цокольная Балтик Браун, 0,28 м2; Плита цокольная Балтик Браун, 0,12 м2; Плита цокольная Лабрадорит, 0,54 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 3,24 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 3,24 м2 | 3 367,25 | 336,72 | 168,36 |
| 61 | Плитка облиц. Капустинский, 0,84 м2; Плитка облиц. Балтик Браун, 0,87 м2; Плитка облиц. Севастопольский, 0,66 м2; Плитка облиц. Токовский, 0,07 м2; Плитка облиц. Балтик Грин, 0,87 м2; Плитка облиц. Балтик Грин, 11,29 м2; Плитка облиц. Григорьевский, 0,51 м2; Плитка облиц. Лабрадорит, 4,03 м2; Плитка облиц. Балтик Браун, 8,23 м2; Плитка облиц. Габбро-Диабаз, 0,54 м2; Плитка облиц. Куру Грей, 7,2 м2; Плитка облиц. Габбро-Диабаз, 0,99 м2 | 8 877,30 | 887,73 | 443,87 |
| 62 | Балясина Гранатовый амф., 7 шт. | 3 696,00 | 369,60 | 184,80 |
| 63 | Плитка облиц. Габбро-Диабаз, 8,24 м2 | 3 716,45 | 371,64 | 185,82 |
| 64 | Крышка Возрождение, 0,36 м2; Крышка Возрождение, 1,5 м2; Крышка, 0,14 м2; Плита Габбро-Диабаз, 1,06 м2; Крышка Возрождение, 0,29 м2; Плита Возрождение, 0,98 м2; Крышка, 3,19 м2; Крышка, 3,23 м2; Балморал Ред, 2,16 м2; Крышка yellow pearl, 0,08 м2; Плита yellow pearl, 0,48 м2 | 2 673,20 | 267,32 | 133,66 |
| 65 | Плитка мощения Габбро-Диабаз, 1,55 м2; Плитка мощения Габбро-Диабаз, 0,95 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 0,54 м2; Плита цокольная Покостовский, 1,22 м2; Плитка разнофор. Возрождение, 0,54 м2; Плита цокольная Покостовский, 1,22 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 0,53 м2; Плитка разнофор. Покостовский, 3,76 м2; Плитка разнофор. Балморал Ред, 0,86 м2 | 1 783,17 | 178,32 | 89,16 |
| 66 | Лом Глушковичский, 1,09 м2; Лом Возрождение, 0,9 м2; Обрезки Покостовский, 0,81 м2; Обрезки Мансуровский, 1,1 м2; Обрезки Мансуровский, 0,28 м2; Обрезки Мансуровский, 0,9 м2; Обрезки Янцевский, 1,4 м2; Обрезки Габбро-Диабаз, 1,08 м2; Обрезки Капустинский, 0,03 м2; Обрезки Балтик Грин, 0,99 м2; Обрезки Капустинский, 1,5 м2 | 213,07 | 21,31 | 10,65 |
| 67 | Плитка облиц. Токовский, 1,67 м2; Плитка облиц. Возрождение, 7,2 м2; Плитка облиц. Мрамор, 0,78 м2; Плитка облиц. Возрождение, 1,1 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,05 м2; Плитка мощения Габбро-Диабаз, 0,95 м2; Цветник Мансуровский, 0,28 м2; Блок Габбро-Диабаз, 0,94 м2; Блок Мрамор, 1,17 м2 | 2 954,84 | 295,48 | 147,74 |

В отношении лотов проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 16 (30150) от 24.01.2024, стр. 14, 15, № 51 (30185) от 13.03.2024, стр. 14, 15

**Местонахождение лотов:** г. Минск, ул. Радиальная, д. 11А

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **19 апреля 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 8 апреля 2024 года до 16.00 17 апреля 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «БЕЛГРАН», проводимых 19.04.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **Евгений, +375293210039. Дополнительная информация по тел. +375293210039.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «БЕЛГРАН», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. 8 (017) 395 89 17 (220070, г. Минск, ул. Радиальная, 11-а)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# Ажурны абярэг...

## «УСІМ ВЫРАЗАЛА. НІКОМУ НЕ АДМАЎЛЯЛА»

— Усе аднавяскоўцы ішлі да цёткі падзівіцца на той папяровы цуд. Мама кажа мне: «Лёнечка, схадзі і ты паглядзі». Ну я і пайшла. Тыя казачныя яркія кветкі, якія абрамлялі абраз, адразу ж запалі мне ў душу. І я захацела навучыцца рабіць такія ж. Сказала аб гэтым цётцы, дык яна перад Вялікаднем прынесла да нас у хату нарыхтоўкі і правяла для ўсіх ахвотных майстар-клас: расказала і паказала, як робіцца набожнік. Я спачатку назірала, як на звычайнай белай паперы расцвіталі кветкі, з'яўляліся птушачкі, арнаменты. Потым паспрабавала сама. І, як не дзіўна, атрымалася з першага разу. Мяне так захапіў сам працэс, што з тых часоў і выразаю. Людзям прыйшліся даспадобы мае набожнікі. Перад Вялікаднем не толькі мясцовыя жыхары, але і нават з суседніх вёсак ішлі да мяне, прасілі зрабіць ажурную аздобу для абраза. Бо ў той пасляваенны час упрыгожыць сваё жытло не было асабліва чым, а атмасферу свята хацелася стварыць кожнай гаспадыньцы. Мама падымаецца ў шэсць гадзін раніцы печ паліць, а я ўстаю і саджуся выразаць. Адным заканчваю, другім пачынаю. Колькі я зрабіла тых набожнікаў за сваё жыццё — не пералічыць. Усім выразала. Нікому не адмаўляла.

***— А мяне навучыце?***

— Стварэнне выцінанкі — работа карпатлівая, патрабуе цярпення і ўседлівасці (недарэмна адна з назваў выцінанкі — «карпіня» — ад дзеяслова «карпець»), але нескладаная. Зрабіць такі набожнік сабе да свята можа чалавек любога ўзросту. Было б жаданне.

Леаніла Якаўлеўна дастае з шафы рулон старых шпалераў. Адразае невялікі прамавугольнік. Маўляў, «каб хутчэй было, зараз зробім набожнічак у мініяцюры. А так я звычайна адмяраю недзе метр па шырыні».

***— А як выбраць паперу для набожніка?***

— Падыдзе ўсялякая, абы беленькая з аднаго боку была. Я свой апошні набожнік, што вісіць у мяне ў зале, рабіла з гэтых вось шпалераў. Шмат гадоў таму ў мяне жылі кватаранты. Хлопцы прыехалі ў саўгас дапамагчы касіць, дык мяне папрасілі, каб пусціла іх пераначаваць. У знак падзякі, даведаўшыся пра маё захапленне, кватаранты падарылі мне цэлы рулон паперы. Ды такой беленькай, танюсенькай. Добрая была папера. Я яе ўсю на свае выцінанкі і пусціла. Гэта сёння ёсць і якасная папера, і фарбы на любы густ і нават прыстасаванні для выразання. Раней жа, памятаю, жанчыны выразалі ажурныя фіранкі ды сурвэткі пад велікодныя булкі з упаковачнай шэрай паперы ці наогул з адбеленай газетнай.



Калі мы прыйшлі, Леаніла Якаўлеўна не сядзела без справы — шыла блузку для сваёй сяброўкі.



Нарыхтоўкі для набожнікаў-выцінанак. У бабулі іх цэлы пакунак.

Бабуля складвае падрыхтаваны прамавугольнік папалам. Тлумачыць, што гэта трэба, каб малюнак на набожніку атрымаўся сіметрычным. Затым выразае адтуліну для абраза ў выглядзе трохкутніка. Апошні аздабляе зубчыкамі ў форме паўмесяца, гэткую самую аздобу робіць і па «берагах» унізе і ўверсе будучага набожніка. Затым малюе карункавы ўзор, у які па-майстэрску «ўплятае» кветачкі, лісточкі, птушак, зайчыкаў... Абавязкова паміж малюнкамі пакідае «сцежачкі», каб выцінанка не развалілася на кавалкі. Пасля гэтага Леаніла Якаўлеўна бярэ фарбы і расфарбоўвае ўзоры ў розныя колеры. Пакуль фарбы сохнуць, згадвае пра Дзімку.

— У нас у вёсцы ёсць надта добры хлопец, дальнабойшчыкам працуе, ён мне часта дапамагае. Дык вось нядаўна прывёз мне цэлы пакунак фарбаў, фламастараў, нейкіх модных маркераў для скетчынгу. «Нашто ж ты, Дзімачка, накупіў мне столькі фарбаў, я ж не мастак? — кажу яму. — Ці ж табе хочацца мне дапамагаць, у цябе ж сваіх спраў безліч». А ён усміхаецца і кажа: «Як будзеш людзям рабіць добра, дык і табе будзе добра».

Леаніла Якаўлеўна дастае канцылярскі нож і пачынае акуратненька выразаць намаляваныя ўзоры.

— Раней рабіла гэта звычайным лязом, але канцылярскім ножычкам значна зручней. Націскаць трэба моцна, каб два аркушы праразаліся наскрозь.

Потым разварочвае, падмалёўвае другі бок, дзе адбіліся такія ж узоры. І, лічы, выцінанка гатовая. Засталося толькі падабраць пад яе абраз і акуратненька прымацаваць іголачкамі да шпалераў.

— Я выразаю не зусім так, як цётка вучыла, а па-свойму. Яна ў першую чаргу разлінейвала ўсю паперу і ўжо на тую ячэістую сетку наносіла ўзоры. Я ж не разлінейваю, адразу малюю. Мне так зручней ды і палосак на кветках потым няма.

***— Адкуль чэрпаеце натхненне?***

— Цяжка прадбачыць, у які момант прыйдзе натхненне, таму ў мяне заўсёды пад рукой аркуш паперы і аловак. Неяк па тэлевізары паказалі такі спрытны баравічок, дык я хутчэй аловак схапіла і перамалявала яго. Я люблю маляваць. Гэта ў мяне, відаць, ад таты, надта ўжо прыгожа ён маляваў. Штосьці прыдумваю з галавы сама, штосьці перамалёўваю са старых часопісаў ды газет. У выніку не заўважыла, як назбірала цэлы пакет нарыхтовак для набожнікаў. Гэта вельмі зручна. Саджуся рабіць новы набожнік, раскладваю іх на стале і выбіраю: тут гэтую птушку пасаджу, там — іншую. У асноўным у якасці ўзору выступаюць кветкі, птушкі або жывёлы, анёлы, галінкі вярбы, бэзу. Для мяне выцінанка — гэта добры антыстрэс. Пасядзіш-павыразаеш гадзінку-другую — і ўсе дрэнныя думкі адступаюць на другі план, праблемы падаюцца не такімі ўжо і невырашальнымі.

***— Але ж папера — матэрыял недаўгавечны, таму, відаць, век у такіх ручнікоў-набожнікаў кароткі?***

— Выраб, сапраўды, вельмі далікатны, але я не сказала б, што недаўгавечны. Усё залежыць, як з ім абыходзіцца. У нашым вясковым дзіцячым садку, у музеі, адзін з набожнікаў, што я падарыла, вісіць ажно з 1991 года. З часам кветкі, вядома, выцвітаюць, робяцца бляклымі, але пры жаданні выцінанку можна зняць і падфарбаваць. Даўней штогод перад Вялікаднем выразалі новыя ўпрыгажэнні, а старыя ніхто не захоўваў. Але мне шкада сваёй працы, таму сваім набожнікам карыстаюся ўжо не адзін год.

***— Як шмат часу патрэбна, каб звычайная папера ператварылася ў арыгінальны абярэг?***

— Раней, калі была маладзейшая, спраўлялася за суткі. Праўда, спала ўсяго некалькі гадзін, так хацелася зрабіць хутчэй, парадаваць людзей. А як цяпер, дык амаль цэлы тыдзень рабіла набожнік у садок, прычым працавала, не падымаючы галавы, практычна цэлымі днямі.

## «ПРОСТА СЯДЗЕЦЬ І ГЛЯДЗЕЦЬ ТЭЛЕВІЗАР — ГЭТА НЕ ПРА МЯНЕ...»

Леаніла Якаўлеўна — майстрыха на ўсе рукі. Яна займаецца не толькі выцінанкай, але і вышывае, вяжа... Навучылася гэтаму таксама ў дзяцінстве.

— Раней ніхто ні на якія курсы не хадзіў. У вёсцы жанчыны збіраліся разам у нейкай адной хаце, вышывалі, вязалі. А мы, дзеці, былі побач, і назіралі за тым, што робяць дарослыя. І, безумоўна, самі спрабавалі. ...На днях вось пачала вязаць кофтачку. Пакуль не ведаю каму. Проста ніткі добрыя былі, мякенькія, мне стала шкада, падумала, як памру, дык іх выкінуць, а звяжу кофту, дык нехта будзе насіць. Знайшла таксама ў шафе шмат кавалачкаў рознай тканіны, думаю, не прападаць жа ім, і пачала вязаць з іх стракатыя круглыя дыванкі на падлогу. Нядаўна паспрабавала вышываць бісерам. Вунь які пышны букет у вазе атрымаўся. Бачыце, як прыгожа пераліваецца на сонцы, вачэй не адвесці. Мне заўсёды было цікава паспрабаваць зрабіць штосьці новае. Бісер дробны, старому чалавеку вельмі цяжка з ім управіцца, але ж як задумала дык сядзела крукам, пакуль не завяршыла. Я ўжо даўно на пенсіі, часу вольнага шмат. Проста сядзець і глядзець тэлевізар — гэта не пра мяне. Таму пастаянна прыдумляю сабе нейкі цікавы занятак.

Калі мы завіталі ў госці да Леанілы Якаўлеўны, гаспадыня не сядзела без справы. Шыла на швейнай машынцы светлую блузку сяброўцы-аднавяскоўцы.

— Таіса — гэтакая добрая жанчына. Калі ідзе ў краму, дык абавязкова мне патэлефануе, запытаецца: «Мо што трэба?» Яна ж маладзейшая за мяне, а мне апошнім часам ногі баляць, цяжка далёка хадзіць. Вось у мяне была добрая тканіна, дык я ёй у падарунак вырашыла штосьці пашыць. Папыталася, што лепш, дык яна замовіла блузку.

— У Навaселлі цётку Лёню ўсе ведаюць як выдатную краўчыху, — кажа **гаспадыня музея Навасельскага дзіцячага садка Ларыса КРЫЛОВІЧ**, якая паказала мне, дзе жыве Леаніла Якаўлеўна. — Яна ўсё жыццё абшывала ўсю нашу вёску. Гэта цяпер усё ў краме можна купіць. А раней дэфіцыт быў, таму людзі сабе адзенне пераважна шылі. Цётка Лёня, памятаеце, як вы мне такую прыгожую сукенку справілі — белую, з чорным пояском — я яе надзявала на 1 верасня, калі толькі прыйшла ў школу працаваць?

**«Цяжка прадбачыць, у які момант прыйдзе натхненне, таму ў мяне заўсёды пад рукой аркуш паперы і аловак. Неяк па тэлевізары паказалі такі спрытны баравічок, дык я хутчэй аловак схапіла і перамалявала яго. Я люблю маляваць. Гэта ў мяне, відаць, ад таты, надта ўжо прыгожа ён маляваў. Штосьці прыдумваю з галавы сама, штосьці перамалёўваю са старых часопісаў ды газет».**

— А як жа не памятаць, у мяне нават твой фотаздымак у ёй ёсць (прыносіць стары альбом). Я любіла шыць, старалася, эксперыментавала, асвойвала нейкія новыя складаныя фасоны. Бывала, прынясуць дзяўчаты тканіну і просяць справіць ім сукенку на выпускны ці на канцэрт. А якую дакладна — не ведаюць. Маўляў, пашыйце на свой густ. «А як не спадабаецца?» — смяюся. Давяралі мне, казалі, маўляў, як вы будзеце шыць, дык спадабаецца.

У нас у родзе было шмат людзей з залатымі рукамі. Мой дзядуля шыў боты, яго сын Мацей — татаў брат — быў прафесійным краўцом. Я ж вучылася швейнаму рамяству ў вясковай майстрыхі цёткі Шуры. Цэлы год штодня хадзіла да яе разам з іншымі дзяўчатамі. Разлічвалася мама за тую вучобу з аднавяскоўкай кабаном. Памятаю, па восені павезлі яго на рынак, прадалі і амаль усе выручаныя за яго грошы я ў вузельчыку аднесла цётцы Шуры. ...Дзяцінства ў мяне было складанае. Праз год, пасля таго як нарадзілася, пачалася вайна. Тата сышоў на фронт, трапіў у палон да немцаў. Маме давялося адной ставіць на ногі траіх дзяцей. Бацька вярнуўся з палону толькі праз сем гадоў і пражыў зусім нядоўга. Там моцна падарваў сваё здароўе. Па вяртанні хадзіў з палачкай, адчуваў, што хутка памрэ. Перад смерцю паказаў маме, дзе ставіць дом, і наказаў: «Насця, ты, як я памру, не надзявай мне найлепшы касцюм, надзень прасцейшы. Усю ж маю адзежу і срэбны гадзіннік (да вайны ён быў таленавітым цесляром, рабіў людзям хаты, дык у яго было шмат добрых рэчаў) аддай людзям, дык яны табе за гэта дапамогуць паставіць хату». Як ён сказаў, так мама і зрабіла.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**
**фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні не спрабуйце вырашаць усё з дапамогай сілы, бо гэтым вы толькі нажывяце сабе ворагаў. Затое ўспрымальнасць і гнуткасць дазволяць набыць сапраўдных аднадумцаў надоўга. У сярэдзіне тыдня можаце апынуцца перад неабходнасцю зрабіць выбар, дзейнічайце спакойна, абдумана і без спешкі. Дыпламатыя і разважлівасць — вашы сябры. Паніка, эгаізм і нястрыманасць — ворагі. У выхадныя выбірайцеся на прыроду, праводзіце час у кампаніі сяброў, не думайце аб праблемах.

**ЦЯЛЕЦ.** Вы, падобна, падсвядома гатовыя да барацьбы і сілавых дзеянняў. Неабходна змяніць і стратэгію, і тактыку, а не паддавацца парывам. Дзейнічайце мякчэй, будзьце дабрэй, змяніце гнеў на літасць, так будзе лягчэй і вам, і навакольным. Трымаючы сябе ў жорсткіх рамках ветлівасці і велікадушнасці, вы можаце быць узнагароджаны нечаканым павышэннем па службе або якім-небудзь іншым, але не менш прыемным падарункам лёсу.

**БЛІЗНЯТЫ.** Ваша сур'ёзнае і добрасумленнае стаўленне да працы не застанецца незаўважаным. Можа паступіць вельмі цікавая і сур'ёзная прапанова, цалкам здольная павялічыць ваш прыбытак. Надыходзіць спрыяльны момант для канкрэтных дзеянняў, адказных крокаў і іншых лёсавызначальных прадпрыемстваў. У выхадныя адпачніце ад мітусні і клопатаў, не шкадуйце часу на сябе.

**РАК.** Неабходна сканцэнтравацца на вырашэнні важных і неадкладных спраў. Паспрабуйце не марнаваць каштоўную энергію. Вы, вядома, моцныя, але дапамога пры прасоўванні па кар'ернай лесвіцы не перашкодзіць. Магчыма ўзнікненне праблем з боку партнёраў, але ў выніку ўсё скончыцца добра, калі праўда на вашым баку. Зрушацца з мёртвага пункта праекты, на якія вы ўжо нават махнулі рукой. Варта сур'ёзна задумацца пра адпачынак.

**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні вас чакаюць разнастайныя падзеі і сустрэчы. Будзьце ўважлівыя, размяркоўваючы сілы і час. Яны спатрэбяцца не толькі на рабоце, але і дома. У панядзелак і сераду верагодныя непаразуменні і канфлікты, паколькі вашы інтарэсы могуць крыху разыходзіцца з інтарэсамі партнёраў. Выявіўшы разважнасць, вы дасягняце з імі кампрамісу. У нядзелю будзьце гатовыя да доўгіх размоў з роднымі.

**ДЗЕВА.** Тыдзень можа быць удалым у плане працы і фінансаў, вам толькі застаецца згладзіць некаторыя шурпатасці. Паспрабуйце максімальна выкарыстоўваць свае творчыя здольнасці. Толькі не вельмі цягніце коўдру на сябе, падзеі разгорнуцца і без вашага ўдзелу. У чацвер завяршыце нясконченыя справы. У пятніцу своечасовыя парады сяброў дапамогуць знайсці аптымальны спосаб вырашэння праблемы, якая даўно непакоіць. Пастарайцеся не адмаўляць сваякам у іх просьбах.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вас чакае шмат работы. Затое, калі справіцеся з ёй, ваш аўтарытэт і заробак павысяцца. Маштабнасць уласных ідэй можа перашкодзіць рэальна ацаніць свае магчымасці. Абмеркаванне асабістых праблем з блізкім сябрам дапаможа шмат што растлумачыць. Паспрабуйце крыху часу прысвяціць утульнасці ва ўласным доме, каб мець магчымасць адпачыць у ім пасля цяжкай працы.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень будзе паспяховы і прыбытковы. Вас можа чакаць напружаны рабочы графік, затое і заплацяць за гэта добра. Аўтарытэт узрасце, уплыў на навакольных павялічыцца. Вы лёгка справіцеся з мноствам задач і рэалізуеце свае планы. З'явіцца магчымасць кар'ернага росту і дадатковага заробку.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні варта ўтрымацца ад гучных заяў і абяцанняў, а таксама ад крытыкі. Упэўненасць у сваіх магчымасцях і паслядоўнасць у дзеяннях дапамогуць заваяваць размяшчэнне навакольных і ўмацаваць добрыя адносіны з начальствам. У аўторак вам неабходна даваць выразныя адказы, а не адыходзіць ад тэмы. У другой палове тыдня будзеце ў добрай форме і зможаце паспяхова завяршыць распачатыя раней справы.

**КАЗЯРОГ.** У вас ёсць цудоўная магчымасць вырашыць праблемы адзіноты і неразумення. Не бойцеся новых знаёмстваў. Рэкамендуюцца актыўнасць і настойлівасць у рэалізацыі сваіх планаў. Удалым будзе засваенне новай прафесіі, здзейсніцца жаданне ўнесці ў сваё жыццё істотныя змены. У выхадныя ёсць верагоднасць нечаканых гасцей.

**ВАДАЛІЎ.** Гэты тыдзень можа прынесці расчараванні і мітусню. Не верце нікому на слова, інфармацыю трэба правяраць. Цяпер непажадана рабіць ніякіх дзеянняў, якія маглі б быць расцэнены як глабальныя. Лепш проста плыць па цячэнні. У пятніцу не варта прыслухоўвацца да парады «добразычліўцаў», лепш слухаць голас сваёй інтуіцыі.

**РЫБЫ.** Верагодныя перапады настрою і канфлікты ў сям'і. Ваша кампетэнтнасць можа падвергнуцца выпрабаванню, не эканомце час на вывучэнні пытання — абапірацца выключна на тое, што вы ведаеце і так, не варта, уласнага досведу можа і не хапіць. Ды і наогул надыходзіць час, калі неабходна вучыцца таму, чаго вы не ведалі. У выхадныя адпраўляйцеся ў падарожжа з дзецьмі.

## 6 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1904** год — нарадзіўся (м. Капыль) Мікола Хведаровіч (Чарнушэвіч Мікалай Фёдаравіч), беларускі пісьменнік, перакладчык. Працаваў у рэспубліканскіх перыядычных часопісах. Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк», Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. У 1938 і 1949 гадах рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1955-м. Аўтар зборнікаў паэзіі «Настроі», «Вайна за мір», «Усім сэрцам», аўтабіяграфічнай аповесці «Споведзь перад будучыняй», кніг нарысаў і ўспамінаў пра беларускіх пісьменнікаў «Памятныя сустрэчы», «Незабыўнае». Пісаў для дзяцей. Пераклаў на беларускую мову паэму Ш. Руставелі «Віцязь у тыгровай шкуры». На вершы Хведаровіча пісалі музыку кампазітары Д. Лукас, К. Цесакоў і іншыя.

**1905** год — нарадзіўся Іван Андрэевіч Флёраў, удзельнік абароны Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, камандзір першай эксперыментальнай батарэі рэактыўных мінамётаў БМ-13 («Кацюша»).



**1936** год — нарадзіўся (в. Казлякевічы, цяпер у Баранавіцкім раёне) Фёдар Пятровіч Сянько, работнік сельскай гаспадаркі, дзяржаўны дзеяч Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

**1937** год — нарадзіўся (в. Рагозіна Лагойскага раёна) Жорж Адамавіч Мрочак, вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання, выдатнік адукацыі Беларусі, вынаходнік СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Савета Міністраў Беларусі, прэміі НАН Беларусі.

У свеце



**1327** год — у царкве Святой Клары ў Авіньёне італьянскі паэт Франчэска Петрарка ўпершыню сустрэў Лауру, якую пакахаў з першага погляду. Потым ён дзясяткі гадоў апяваў яе ў сваіх санетах.

**1748** год — знойдзены руіны Пампеяў (Італія). Пампеі — старажытнарымскі горад недалёка ад Неапаля, у рэгіёне Кампанія, пахаваны пад пластом вулканічнага попелу ў выніку вывяржэння Везувія ў 79 годзе н. э. Цяпер — музей пад адкрытым небам. Унесены ў Спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

**1833** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Пыпін, расійскі літаратуразнавец, этнограф, фалькларыст, які ўпершыню ахарактарызаваў і абагульніў найважнейшыя працы па беларускай этнаграфіі і фальклору, акадэмік Пецярбургскай АН.

**1836** год — дата нараджэння Мікалая Скліфасоўскага, хірурга, дэкана медыцынскага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта. Адзін з піянераў укаранення ў хірургію прынцыпаў антысептыкі і асептыкі, хірургіі брушной поласці і ваенна-палявой хірургіі.

**1841** год — нарадзіўся Іван Сурыкаў, паэт, аўтар вершаў, паэм «Пакаранне смерцю Сценькі Разіна», «Садко» (на яе аснове створана аднайменная опера М. Рымскага-Корсакава). Некаторыя яго творы сталі народнымі песнямі: «Рабіна» («Что стоишь, качаясь...»), «У стэпе» («Степь да степь кругом») і іншыя.

Так гаварыў...

**ГЕОРГ ЛІХТЭНБЕРГ:**

*«Перамудрыць — адзін з самых ганебных відаў глупства».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.29 | 19.55 | 13.26 |
| Віцебск — | 6.17 | 19.47 | 13.30 |
| Магілёў — | 6.19 | 19.46 | 13.27 |
| Гомель — | 6.18 | 19.40 | 13.22 |
| Гродна — | 6.45 | 20.10 | 13.25 |
| Брэст — | 6.48 | 20.08 | 13.20 |

### Месяц

***Апошняя квадра 2 красавіка. Месяц у сузор'і Рыб.***

### Імяніны

***Пр.*** *Арцёма, Захара, Пятра, Сцяпана, Уладзіміра, Якава.* ***К.*** *Ады, Ізольды, Вільгельма, Пятра, Часлава.*



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +20..+22°C | КІЕЎ +15..+17°C | РЫГА +14..+16°C |
| ВІЛЬНЮС +15..+17°C | МАСКВА +13..+15°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +6..+8°C |

## УСМІХНЕМСЯ

**— Я аддала табе найлепшыя гады майго жыцця! — крычыць жонка мужу.**

**— Не палохай мяне, няўжо наперадзе яшчэ і найгоршыя?**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 11.742. Індэкс 63850. Зак. № 889.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 красавіка 2024 года.